Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 8 Вільня, Серада 27-га красавіка 1927 г. Год 1

Сьвята Працы.

I сёлета, як кожны год, працоўныя ўсяго сьвету выйдуць у дзень 1-га мая на вуліцы і плошчы местаў—з чырвонымі сьцягамі, спраўляючы сваё традыцыйнае Сьвята Працы. I сёлета ў гэты дзень горда і сьмела будзе разьлягацца магутны кліч да еднасьці ўсіх працоўных, ня гледзячы на гранічныя межы, што дзеляць народы, ня гледзячы на рэпрэсіі, якімі адказвае работнікам сусьветны Капітал за імкненьне да вызваленьня спад ягонае ўлады.,.

Еднасьць работнікаў усіх краёў і ўсіх народаў—гэта ня пусты гук, не беспадстаўнае лятуценьне ідэалёгаў сацыялізму. Праўда, у сусьветнай вайне ўрадам ваяваўшых дзяржаваў удалося падняць народ на народ, работнікаў на работнікаў і сялян на сялян, пагнаўшы іх забіваць адны адных бяз жалю і міласэрдзя. Але тое страшэнства, якое было зроблена рукамі „цывілізаваных" народаў, не прайшло бяз сьледу на настроях і думках учорашніх ваякаў: крывавы туман ужо разьвеяўся, і сярод працоўных усяго сьвету усё ярчэй і ярчэй выяўляецца імкненьне да еднасьці, а побач з гэтым—рашучы пратэст проці новых войн і праліваньня крыві людзкое.

Якраз напярэдадні 1-га мая яркі доказ рашучага павароту ў настроях работніцкае клясы ў імпэрыялістычных гаспадарствах далі работнікі найбольш імпэрыялістычнае з усіх дзяржаваў сьвету — Англіі. На толькі-што адбытым зьезьдзе сяброў англійскае Партыі Працы ў Лейчэстары старшыня зьезду, шотландзкі пасол у англійскі парлямант Джэмс Макстон, у моцных словах выказаў пагляд аб'яднаных у Партыі Працы работнікаў Англіі на крывавы паход Англіі проці вызвольнага руху ў Кітаі.

— „Работнікі Англіі — казаў ён — ждуць вызваленьня Кітаю з-пад чужацкага ярма. Калі Кітаю, Расеі і Індыі ўдасцца аб'яднацца і ўтварыць адзін „інтэрнацыянал", дык гэта будзе такая магутная сіла, што яна здолее перастроіць увесь цывілізаваны сьвет".

Так гаварыў Макстон. А ў выніку ягонае прамовы, горача вітанае зьездам,—вялізарная большасьць учасьнікаў зьезду ў галасаваньні 312 галасамі проці 118 правзліла кандыдатуру на скарбніка партыі былага павадыра яе МакДональда, якому работнікі закідаюць, што, як быў прэм'ерам, блага бараніў інтарэсы Кітаю, які збудзіўся зо сну...

Так прынамся апісвае гэты мамэнт зьезду „Газ. Варш. Пор.", абураная гэтым запраўды-ж сьветлым зьявішчам у адносінах працоўных масаў імпэрыялістычнае Англіі да ўцісканых ею „каляровых" народаў...

Голас англійскае Партыі Працы — гэта доказ таго, што ў сьвядомасьці вялізарнае арміі працоўных усяго сьвету знайшла ўрэшце належнае мейсца і зразуменьне тая вялікая праўда, што барацьба за сацыяльнае вызваленьне Працы спад панаваньня Капіталу ня можа, не павінна прайсьці міма змаганьня паняволеных народаў за сваё нацыянальнае вызваленьне. I гэта знойдзе шчыры водгалас у сэрцах усіх беларусаў, усіх нашых рабачаяў — ці то працуючых на ральлі, ці па фабрыках і заводах. Бо гэта красамоўна нам гавора, што ў той мамэнт, калі работніцкія масы Польшчы здабудуць для сябе належнае месца ў дзяржаўным жыцьці, для нас настане мамэнт зьдзейсьненьня нашых найвышэйшых ідэалаў—як сацыяльных, так і нацыянальных.

З гэтай сьвядомасьцяй у дзень Сьвята Працы выйдуць на вуліцу поплеч работнікі ўсіх нацыянальнасьцяў Польшчы—палякі і беларусы, жыды і немцы, украінцы і літвіны. I ўсіх іх у гэты дзень аб'яднае супольны ўсім працоўным ідэал вызваленьня Працы.

„Страшэнныя паліцэйскія практыкаваньні".

Пад гэткім загалоўкам „Кур. Віл." з 21 красавіка с. г. зьмясьціў наступнае пісьмо дырэктара Беларускае Гімназіі ў Радашковічах:

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Будзьце ласкавы зьмясьціць у Вашай газэце наступнае:

У нядзелю 3 га красавіка б. г. у 8 гадз. раніцы быў арыштаваны вучань Радашкоўскай Беларускай Гімназіі Уладзімір Мазоль і адпраўлены ў Маладэчна, гдзе яго зачалі „badać" у новым будынку Староства. Каля 7—8 асоб увабраных па-цывільнаму разам з асьпірантам паліцыі змушалі Мазаля прызнацца, быццам ён належыць да камсамолу і ў іншых рэчах. Бадалі Мазаля наступным спосабам: прывязалі рукі да бёдраў, прысутныя пачарзе білі яго кулакамі па твару і целу, бралі за валасы і стукалі галавой аб сьцяну, укладалі пальцы ў ноздры, расьцягвалі іх і пагражалі, што паламаюць робры. Праз гадзіны дзьве катаваньне было паўторана.

Адпраўлены ў Ліду Мазоль быў дапрошаны сьледчым судзьдзёй, які яго звольніў, бо, відаць, навет катаваньне не магло даць ніякіх дадзеных да абвінавачаньня яго.

Праз увесь час, ад нядзельнай раніцы і да палудня серады, Мазалю выдалі толькі аднаго селядца і адно кілё хлеба, чаму Мазоль змушаны быў галадаваць, ня маючы пры сабе ані гроша.

Дырэктар Гімназіі
А. Стэцкевіч

м. Радашкавічы
17./IV. 1927 г.

Да пісьма ад сябе рэдакцыя польскае газэты дадае:

„Сухая рэляцыя аўтара пісьма кідае жахлівае сьвятло на дзейнасьць нашых (польскіх) паліцэйскіх органаў на мясцох. Калі факты, пададзеныя нашым інфарматарам, точна прадстаўлены, дык маем дзела 1) з беспадстаўным арыштам грамадзяніна, пры чым абцяжаючую акалічнасьць прадстаўляе малады век заарыштаванага, 2) з прымушаньнем да паказаньняў шляхам мукаў. Вынік можа быць толькі адзін: безадкладная інтэрвэнцыя адміністрацыйных і судовых органаў. Вінавайцы мусяць быць пакараны з усей строгасьцяй закона.

„Ды гэтага не даволі. Учасьце 7 — 8 асоб паказуе, што мы маем дзела з зьявішчам, прызнаным сыстэмай, ужыванай мяйсцовымі паліцэйскімі ўладамі ў Маладэчне. Без адабрэньня з боку мяйсцовае палітычнае адміністрацыі і адноснага начальніка павятовае паліцыі падобныя факты — нямысьлімыя".

Назаўтрае „Слово" падало вестку, што віленскі ваявода паслаў спэцыяльнага ўрадоўца дзеля разгляду гэтае справы на месцы.

Мусім прызнацца тутака, што і наша Рэдакцыя атрымала адначасна з „Кур Віл.". аднолькавае пісмо дырэктара Радашкоўскае Гімназі, аднак мы не адважыліся яго надрукаваць, баючыся ....канфіскацыі! Бо-ж нядаўна газэта была сканфіскавана за ...надрукаваньне карэспандэнцыі аб недапушчэньні паліцыяй пастаноўкі беларускага спэктаклю! Цяпер, калі пісьмо прайшло ў польскай газэце і выклікала інтэрвэнцыю вышэйшае адміністрацыі, якая, відаць, дагэтуль мала звярачала ўвагі на паступкі паліцыі на мясцох,— спадзяемся, што нашае газэты за гэтае пісьмо не сканфіскуюць...

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Канкурэнцыя разгараецца.

Беларускія буржуазныя групы і паасобныя „дзеячы", як ведама, цалком падпарадкаваліся польскай дэфэнзыве і супольнымі сіламі павялі барацьбу з беларускім сялянска работніцкім радыкальным рухам. Да аднаго супольнага катла заселі і сельсаюзьнікі, і Валэйша, і Павлюкевіч, і ўрэшце новастворная група „Беларускага Дня". Уладжанае сельсаюзьнікамі і хадэкамі—з дазволу і багаслаўленьня дэфэнзывы!—дэманстрацыйнае сьвяткаваньне ўгодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі (хаця аб гэтых угодках радыкальнай прэсе навет успамінаць было забаронена!) мела мэтай даць яркае выяўленьне еднасьці правіцова-дэфэнзыўных кірункаў. I ўсё было-б добра, каб новаахрышчаныя „незалежнікі" не перагрызьліся паміж сабой за... казённыя бутэрброды!

Сьпярша заварушыўся „доктар" Павлюкевіч, які не на жарт спалохаўся, што пасол Ярэміч пазбавіць яго куска хлеба. Дык навет на „незалежніцкім" банкеце Павлюкевіча ня было: вось, толькі побач пакленчылі разам у касьцеле і царкве—Павлюкевіч з Ярэмічам, Рагуляй і ўсей кумпаніяй з „Беларускага Дня". Але-ж хутка аказалася, што і з другімі „таварышамі па працы" неяк ня ладзяць хадэцка-сельсаюзьніцкія павадыры.

Па Варшаве разыйшлася нядаўна чутка, што сельсаюзьніцкі павадыр пасол Ярэміч падаў міністру ўнутраных спраў нейкі „дужа сакрэтны" мэморыял. Як апавядаюць у варшаўскіх газэтных колах, п. Ярэміч у гэным мэморыяле меўся растлумачыць уладзе, што фармальная ліквідацыя „Грамады" не зьліквідавала грамадаўскіх настрояў, — дык вось, хай урад дасьць сельсаюзьнікам некаторыя „канцэсіі", а яны ўжо „дaканаюць" і „Грамаду" і грамадаўскія настраеньні ў масах... На падставе гэтае чуткі ў „Роботніку" і „Кур. Варш." у адзін дзень зьявіліся стацьці аб „Сялянскім Саюзе", і ў абедзьвюх газэтах быў высказаны пагляд на сельсаюзьнікаў, як на лішне слабую сілу, каб з ею паважна лічыцца. „Роботнік" так і напісаў, што сельсаюзьнікі ня маюць ніякіх уплываў на масу,—а „Кур. Варш." дужа ядавіта адазваўся аб тых „радыкальных" стацьцях, якія „Сялянская Ніва" крывадушна друкуе, каб абаламуціць масы і перахапіць уплывы „Грамады". Наадварот, аб ідэях „Беларускага Дня" і „Жэчпосполіта" і „Глос Правды" пішуць з вялікім захапленьнем. Вось, гэта так абурыла сельсаюзьнікаў, што яны ня вытрымалі і крэпка сцебанулі сваіх „сабутыльнікаў" з „незалежніцкага" банкету, бачучы ў іх больш небясьпечнага канкурэнта на „панскую ласку", чым Павлюкевіч, ці то кум — Валэйша! Падаем цалком заметку з № 36 „Сялянскае Нівы", пасьвячоную „Бел. Дню":

„ — **Вада на пусты млын.** Ідэя „Умястоўскага" „Беларускага Дня" (польскае газэты ў беларускай мове) аб згодзе і супрацоўніцтве мае вялікі пасьпех у Палякаў.

„Рэчпаспалітая" піша, што гэтае „ўмястоўскае" супрацоўніцтва павінна іцьці па лініі сучасных апазіцыйных правіцовых партыяў, а „Голас Праўды" гавора наадварот, што супрацоўніцтва павінна іцьці па лініі ўрадавых групіровак.

„Уся гэтая гутарка польскае прэсы — вада на пусты млын, бо сам паляк Умястоўскі ў тройчнасьці з „сацыялістым" Гурыным і палянафілам М. Косьцевічам і бяз гэтага са ўсімі палякамі супрацоўнічаюць, а паміма гэтага „Беларускі Дзень" нікога не рэпрэзэнтуе і калі гавора, толькі ад імя сваей тройкі.

„Гэта належала-бы ведаць польскай прэсе".

Да якога завастрэньня дайшла канкурэнцыя паміж беларускімі буржуазнымі групамі, сьведчыць хаця-бы факт, што—пасьля выхаду першага нумару месячніка „Родныя Гоні"—орган сельсаюзьнікаў страшэнна пакрыўдзіўся на рэдакцыю журнала за тое, што тая падала няпрыемную для „Бэл. Дня" заметку, у якой назвала гэную часопісь „польскай газэтай у беларускай мове"... А цяпер сама-ж „Сялянская Ніва" паўтарае словы „Родных Гоняў", толькі падбавіўшы вострасьці на сто працэнтаў!

Мусіць і запраўды хутка будуць выбары ў Сойм, калі паміж старымі пасламі і новымі кандыдатамі на пасольскія мандаты ўзгарэлася гэткая грызьня: ўсе-ж яны хочуць чарпануць патрэбныя на выбарную агітацыю грошы... з аднае кішэні!

Выбары ў гмінныя рады у Віленска-Троцкім павеце.

У пачатку месяца мая на абшары Віленска-Троцкага павету адбудуцца выбары ў гмінныя сходы і рады.

Выбары абыймаюць гміны: немэнчынскую, падбярэскую, варнянскую, шумскую, міхаліскую, міцкунскую, рудзіскую, троцкую і рудамінскую.

Выбары ў гмінныя сходы адбудуцца 2-га мая, у рады—21 мая.

Як ведама, Віленска-Троцкі павет мае вельмі рознароднае па нацыянальнаму складу насяленьне: побач з беларусамі—літвіны і палякі (пераважна апалячаныя тыя-ж беларусы ды літвіны). Польскія нацыяналісты ўсе сілы свае напружаюць, каб на выбарах даць перамогу праўдзівым ці фальшывым палякам, якія ішлі-бы пасьля **рука ў руку з польскімі абшарнікамі — ў імя „нацыянальнае еднасьці"**. Вось-жа ўсе выбаршчыкі **сяляне і работнікі ў межах пералічаных гмінаў павінны згаварыцца і правадзіць у гмінныя сходы і пасьля ў рады толькі тых прадстаўнікоў, якія роўна шануюць усе нацыянальнасьці і ня пойдуць на ўслугі абшарнікаў, а будуць бараніць у гміне ды ў павеце інтарэсы працоўнага народу.**

Памятайце, грамадзяне, што ад вынікаў выбараў на доўгія гады будзе залежыць ваш уласны дабрабыт!

З міжнародавых адносінаў.

„Слово", віленскі орган міністра Мэйштовіча, у суботнім нумары дае цэлы рад дужа цікаўных і характэрных для міжнародавае палітыкі вестак.

Як відаць, у сувязі з апошнім зьліжэньнем Польшчы з Англіяй і падпарадкаваньнем яе палітыкі англійскім палітычным уплывам,—адносіны да Польшчы былых саюзьніц яе пачалі вельмі выразна зьмяняцца. Парыжскі карэспандэнт „Слова" інфармуе, як глядзіць маладое пакаленьне францускіх грамадзкіх і палітычных дзеячоў на адносіны да Польшчы.

— „Я залічаю сябе да прыхільнікаў Польшчы, — сказаў карэспандэнту „Слова" Альфрэд Фабр Люс,—і зусім не стаю на становішчы прысьпешанае і аднабокае (на карысьць аднае Нямеччыны) зьмены польскіх граніц. Ня маю наагул ніякае пэўнасьці, што зьмена гэтая зьдзейсьніцца. Лічу аднак, што польская апінія (грамадзянская думка) не павінна ашуківаць сябе адносна да таго, як мы, маладыя, разумеем француска-польскі саюз. Француская дыпляматыя будзе заўсёды ляяльная і будзе бараніць правы Польшчы, але аб **мабілізацыі французаў дзеля абароны „калідору" немагчыма навет падумаць"**.

У тым жа нумары „Слово" друкуе вялікую перадавую стацьцю аб палітыцы балтыцкіх дзяржаваў. У гэтай стацьці гаворыцца, што сучасны латвійскі ўрад рашуча пакінуў шлях супрацоўніцтва Латвіі з Польшчай, а латвійскі міністар замежных спраў Цэленс „уцягнуў Латвію ў ігру радавых уплываў, маючы адначасна падтрыманьне з боку Нямеччыны"...

Бадай ці ня мае сувязі з агульнай зьменай адносінаў паміж Польшчай і яе ўчорашнімі саюзьнікамі тая сэнсацыйная вестка, якую—ізноў-жа ў тым-жа суботнім нумары— падало „Слово".—У апошнія дні—піша газэта — ў Вільні пашыралася сэнсацыйная вестка, падаваная ня ведамымі асобамі, быццам паміж Літвой і Польшчай ідуць тайныя перагаворы, па падставе якіх **Вільня мае стацца Вольным Местам**—кшталтам Гданска. „Слово" тлумачыць зьяўленьне гэтае весткі тым, што існуе праект пераносу чыгункавае дырэкцыі з Вільні ў Беласток...

Ці гэта так, ці ня так,—весткі, паданыя „Словам", маюць вялізарную вагу, як выяўленьне новага ўкладу палітычных адносінаў навакол Польшчы.

Ніколі не зьнішчажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Контр-рэвалюцыя у Кітаі.

Пасьля развалу нацыянальнага руху.

Вельмі цяжка разабрацца цяпер у тым, што і як робіцца ў Кітаі. Адно відаць ясна: гэта — тое, што разьдзяленьне сацыяльных і нацыянальных лёзунгаў, што былі аб'ядналі ўсе рэвалюцыйныя кірункі ў арміі кантонскага ўраду, страшэнна пашкодзіць справе вызваленьня Кітаю спад цяжкай рукі імпэрыялістаў. Навет пэпэсаўскі „Роботнік", які заўсёды цешыцца з няўдач кітайскіх „камуністаў" і радавага ўраду, — і той зразумеў, што разьбіцьцё адзінства Куо Мін-Тангу (партыі нацыянальнага аб'яднаньня) змарнуе ўсе вынікі пачатковых перамогаў Кантону.

Як шмат дзе інш, і ў Кітаі свая контр-рэвалюцыйная буржуазія, ня кажучы ўжо аб уплывах замежных—чужаземных, спалохалася сацыяльных лёзунгаў Кантону дый, прычапіўшыся да „камунізму", з бяссумліўнай дапамогай імпэрыялістычных дзяржаваў, — замест таго, каб, апіраючыся на магутны ўздым масаў, даканчыць вызваленьня Кітаю ад апекі чужаземцаў, — распачала расправу з масавым народным рухам... Ясна, што перамога контр-рэвалюцыйнай буржуазіі ў Кітаі азначала-б канец барацьбы за незалежнасьць Кітаю і ўгоду з чужаземным імпэрыялізмам—на варунках, якія прадыктуе ён, а не пераможныя арміі барацьбітаў за вызваленьне...

Цікаўна, што найвялікшая перамога народных арміяў — узяцьце Шанхаю, найбольш падняўшая дух масаў у Кітаі, якраз зьявілася пераломным мамэнтам усей вялікай эпапэі.—Замест таго, каб даканчыць ды выкарыстаць да канца перамогу, галоўны павадыр кантонскіх арміяў Чанг-Кай-Шэк неяк „паразумеўся" з англійцамі ў Шанхаі, ды адразу зьмяніў фронт: абапершыся на Шанхай, як на новую „базу даставаў" (пэўна-ж англійскую ды амэрыканскую...), ён скіраваў фронт назад—на Кантон і Нанкін... Ці можна, пасьля таго верыць весткам з Кітаю, быццам Чанг-Кай-Шэк ...прадаўжае наступленьне проці Чанг-Тсо-Ліна, маючы 300-тысячную армію?!—Бо-ж аднача сна йдуць пэўнейшыя весткі, што ў першую чаргу наступленьне яго арміі скіравана проці Ханькоў, дзе пануе яшчэ ўрад левага крыла Куо-Мін-Тангу. Зусім недарэчна думаць, каб Чанг-Кай-Шэк пачаў ваяваць на два фронты — проці Ханькоў (—генарала Фэнга) за якім стаіць СССР, і Чанг-Тсо-Лінам, за якім стаіць Японія,—калі новы японскі ўрад рашуча паразумеўся з Амэрыкай і Англіяй у справе супольнай акцыі ў Кітаі...

Фатальныя рэзультаты разьбіцьця адзінства нацыянальных арміяў вельмі ярка відаць з таго, што Англія цяпер ня толькі не прапануе распачаць перагаворы таму ці іншаму кітайскаму ўраду, ня толькі ня спыніла падрыхтаваньняў да паходу на Кітай, але наадварот — усё шле ды шле ў Кітай новыя сілы—марскія і сухапутныя, чакаючы адпаведнай часіны, каб распачаць адкрыта сваю акцыю... А пакуль што англійскі ўрад прапануе супольную — з Амэрыкай, Японіяй і Францыяй — блёкаду ўсіх кітайскіх партоў... Аправіўшыяся ды разахвоціўшыяся, імпэрыялісты чакаюць, каб у страціўшай цяпер усялякі нацыянальны ды сацыяльны сэнс і зьмест хатняй вайне Кітай чым больш змарнаваў сілаў, каб пасьля — пад жэрламі наведзеных гарматаў — прадыктаваць яму свае варункі міру... Дзеля таго можна навет дапусьціць, што Англія з Амэрыкай могуць фінансаваць Чанг-Кай Шэка ў яго барацьбе ня толькі з „камунізмам" у Кітаі, але кінуць яго арміі навет і на Пэкін ды Мукдэн.—Бо тады дзьве галоўныя ды амаль-што ня роўныя сілы Кітаю будуць аканчальна зьніштожаны ў узаемнай недарэчнай барацьбе. А гэта ж—найбольш на руку дзяржавам-жываедам!

Што будзе ў далейшым рэзультаце гэткага канца рэвалюцыі ў Кітаі, проці якой быццам умяшаліся ў кітайскія справы „шляхотныя вялікія дзяржавы", лёгка зразумець: кітайскі народ, апынуўшыся ізноў, пасьля такога слаўнага пачатку барацьбы за сваё вызваленьне, пад падвойным жалезным ботам сваей і чужаземнай буржуазіі, пэўна-ж не зрачэцца свайго права на наненавісьць, помсту і далейшую барацьбу—проці абедзьвюх... Дык ясна, што агідная тактыка дзяржаваў у Кітаі, пабудаваная на ашуканстве, правакацыі ды подкупах, дасьць свае плады ў хуткім часе—у відзе новай барацьбы, яшчэ больш крывавай, чым дасюль...

Умова 5 дзяржаў у справе блёкады Кітаю.

Як толькі ўтварыўся новы японскі ўрад, зараз-жа — па прапазіцыі Англіі — пачаліся нарады прадстаўнікоў 5 вялікіх дзяржаваў у Кітаі — у справе зачыненьня ўсіх партоў Кітаю (блёкады) флётамі гэтых дзяржаваў. Гэткім чынам дзяржавы маюць змусіць усе кітайскія ўрады, якія згодна былі заявілі, што дамагаюцца рашучага скасаваньня шкодных targовых дагавораў, да прыняцьця варункаў, якія будуць прадыктаваны дзяржавамі. Бо-ж, здаецца, блёкада для барацьбы з „камунізмам" у Кітаі зусім непатрэбна.

Англійскія войскі ідуць ды ідуць.

1000 жаўнераў англійскай паветранай эскадры ды шмат гарматаў, аўтамабіляў і бранявікоў выслана 20-га красавіка (ўжо пасьля здрады Чанг-Кай-Шэка) з Англіі ў Кітай.

Супярэчныя весткі аб наступленьні Чанг-Кай-Шэка на поўнач.

22-га красавіка пішуць з Шанхаю праз Лёндан, быццам Чанг-Кай-Шэк перайшоў у наступленьне проці паўночных арміяў, пераправіўшыся ды ўкрапіўшыся на паўночным беразе ракі Ян-Цзэ. Быццам зараз-жа завязаліся крывавыя баі на гэтым беразе з войскам Чанг-Тсо Ліна.

А вось, што кажа тэлеграма з 23 красавіка з Шанхаю ж: Чанг-Кай Шэк заявіў францускім журналістам, што лічыць зусім магчымым аб'яднаньне з Чанг-Тсо-Лінам — дзеля супольнай акцыі проці „камуністаў" і... „усіх заграцічных душыцеляў Кітаю".

Ці справа чырвонага Кантону — зусім праіграна?

Як ведама, у апошні час Ханькоўскі ўрад назначыў генарала Фэнга, калісьці ваяваўшага з Чанг Тсо Лінам, галоўным камандзірам усіх „чырвоных сілаў" у Кітаі. З Лёндану паведамляюць, што ген. Фэнг ужо распачаў наступленьне проці Пэкіна і Пянь Дзіну.

Цікаўныя весткі падаюць нямецкія газэты, кітайскія карэспандэнты якіх пішуць, што ў цэлым радзе правінцыяў ня толькі ня спыніўся, але ўсьцяж расьце чырвона-нацыянальны рух, які патрымлівае ўрад у Ханькоў, — пад той час, як за Чанг-Кай-Шэкам стаіць (дзіва, што стаіць — пад штыкамі яго жаўнераў!) толькі насяленьне ўзьбярэжжа ад Шанхаю да Нанкіна. Датаго ж — „паводле пэўных вестак, генарал Шэк ня можа быць пэўны навет у жаўнерах сваей арміі, настроі якіх зусім не такія прыхільныя да яго новай справы"... Дык ясна, што ў кожны мамэнт можна спадзявацца новай зьмены палажэньня.

Для характарыстыкі настрояў у Кітаі наагул цікаўны факт падае англійская прэса. Ясна піша, быццам у занятым Чанг-Тсо-Лінам радавым пасольстве ў Пэкіне знойдзены розныя „кампрамітуючыя дакумэнты", паміж якімі быццам адзін сцьвярджае, што сам асабісты ад'ютант Чанг-Тсо Ліна атрымаў ад радавага ўраду... 400 тысяч даляраў і меў атрымаць яшчэ больш, калі... замах на Чанг Тсо-Ліна будзе й фактам дакананым! Кампрамітуючы дакумэнт — няма што казаць. Але толькі вось пытаньне: Каго ён больш кампрамітуе? Бяспрэчна, ён характэрызуе толькі „пэўнасьць настрояў" у лагеры кітайскай контр-рэвалюцыі...

Ня менш цікаўныя весткі, што, Чанг-Тсо-Лін асыгнаваў па 200 тысяч даляраў за выкрыцьце кожнае жанчыны, якая займаецца шпіёнствам на яговую шкоду. Кажуць, што такіх шпіёнак расплодзілася ў яго сатрапіі — вялізарная колькасьць. Усе яны працуюць на карысьць кантонскага руху...

З другога канца.

Пакуль-што, як відаць, у Кітаі ў працягу нейкага часу можа будзе мець пасьпех падтрыманая чужаземнымі дзяржавамі контр-рэвалюцыя. Можа, Англія на нейкі час апраівіцца ад удараў і стратаў у Кітаі. Але ў Англіі гэтулькі „хворых" ці „чулых" мейсцаў, што клапоты яе, неяк залатаныя ў адным мейсцы, зараз-жа пачынаюцца ў другім.

22-га красавіка здарыўся факт, які пэўна-ж выкліча вялікую трывогу ў Англіі: падпісаны новы трактат **прыязьні і саюзу паміж СССР і Афганістанам**, краем, які ляжыць між сярэдняя азіяцкімі валаданьнямі СССР і англійскай Індыяй, ды іграе ролю „брамы" з аднаго краю ў другі. Ведама, што Англія заўсёды найгорш баялася сухапутнага паходу Расеі на Індыю, няраз пагражаючы вайной царскім урадам за найменшы падазроны рух расейскае дыпляматыі ў Афганістане. А цяпер Афганістан стаўся амаль ня часткай Радавага Саюзу.

Радавы ўрад урачыста адсьвяткаваў падпісаньне важнага пасьпеху сваей дыпляматыі ў Азіі, запрасіўшы на ўрачыстасьць паслоў Турцыі, Пэрсіі і іншых. Радавая прэса дакладна высьвятляе значэньне пераходу Афганістану пад уплывы Радаў, **лічучы гэты трактат дастойным адказам на падрыхтаваную англійскім урадам контррэвалюцыю ў Кітаі.**

Трэба дадаць, што гэтым трактатам адразу касуюцца ўсе тыя фортыфікацыі, якія зроблены Англіяй, каб перашкодзіць магчымасьці нападу праз Афганістан на Індыю.

Заява п. прэзыдэнта Масьціцкага.

П. Прэзыдэнт Польскай Рэспублікі меў цікаўную гутарку з амэрыканскім журналістым, якая апублікавана ў амэрыканскіх газэтах.

„Польшча,—казаў высокі аратар,— хоча міру ды працуе дзеля яго ўкрапленьня... Армію Польшча ўтрымоўвае дзеля абароны граніцаў ды забясьпечаньня міру. Некаторыя думаюць, быццам марш. Пілсудскі мае нейкія ваенныя пляны... Гэта няпраўда: я ведаю марш. Пілсудскага 33 гады і магу заявіць, што ён ня мае найменшае ахвоты ўблутаць Польшчу ў вайну. Усялякія чуткі аб мілітарыстычных мэтах марш. Пілсудскага пазбаўлены ўсялякай падставы".

Далей, кажучы аб палажэньні нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, п. Прэзыдэнт сказаў паміж іншым:

„Мы ідзем да паляпшэньня адносінаў з нацыянальнымі меншасьцямі — ня шляхам слоў, але шляхам дзела. Наш урад аднолькава адносіцца да ўсіх грамадзян, ня робячы ніякай розьніцы паміж жыхарамі Краю... Мы робім гэта не дзеля якіх-небудзь асаблівых рашчотаў, не прапануем якім-небудзь паасобным групам канцэсіяў, дый не спадзяемся ад іх хуткай удзячнасьці... Ня зьбіраемся даваць якія-сь спэцыяльныя прывілеі некаторым групам меншасьцяў. Маючы на мэце агульнае аздараўленьне палажэньня, будзем бесстаронна і справядліва адносіцца да ўсіх нацыянальных меншасьцяў".

Гэтая заява п. польскага Прэзыдэнта, пэўне-ж, не пазбаўлена некаторае сувязі з перагаворамі аб амэрыканскай пазыцы для Польшчы...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

У справе пазыкі для Польшчы.

Польскае агенцтва паведамляе, што дырэктар парыжскага аддзелу „Супалкі Банкаў", якая мае даць Польшчы пазыку — 70 мільён. дал., заявіў, што прынцыпова справа пазыкі ўжо вырашана аканчальна. Гэты дырэктар, п. Монэ, мае зараз-жа ізноў прыехаць у Варшаву, каб скончыць апрацаваньне дакладных варункаў пазыкі.

Газэты пішуць, што гэтае апрацаваньне варункаў займе каля 3 тыдняў.

Цікаўныя рэвэляцыі ў справе праектаваных варункаў пазыкі ізноў зрабіў быўшы прэм'ер Ул. Грабскі. Ен напісаў страшэнна востры пратэст проці таго, што пазыка для Польшчы мае быць дадзена ня толькі Амэрыкай, Англіяй і Францыяй, але таксама і—Нямеччынай... Гэткім чынам кантралер ці „наглядчык"-паўнамоцнік „Банкавага Трэсту", які будзе сядзець у Варшаве, мае быць, паміж іншым, даверанай асобай і Нямеччыны... Гэтыя рэвэляцыі, відаць, мелі нейкую падставу. Цяпер паўафіцыяльна публікуецца, што нямецкая біржа ня будзе паклікана да ўчасьця ў рэалізацыі польскай пазыкі. Але Грабскі слушна пісаў у „Кур. Варш.", што немцы маюць вялізарныя ўплывы ў Амэрыцы, што добра выкрыў знамяніты „Маніфэст сусьветных банкіраў". А вось амэрыканскі капітал мае выразную мэту — даць Нямеччыне ўсё сваё падтрыманьне ў яе імкненьні да таго, каб — зусім мірным шляхам—змусіць сваіх суседзяў да „ўступак" (ведама-ж перадусім — тэрытарыяльных!), — да звароту часткі таго, што яны „перарабілі ў захапленьні перамогай—у Вэрсалі"...

Новы прэсавы дэкрэт.

Рада міністраў зацьвярдзіла 22 красавіка тэкст другога прэсавага дэкрэту, хутчэй — з ж двух дэкрэтаў, якія зараз-жа будуць пададзены для падпісу п. Прэзыдэнту і хутка маюць стацца — на неабмяжаваны час—законам для нас.

Справа йдзе аб дэкрэце ў справе новых правіл, рэгулюючых жыцьцё прэсы, і аб дэкрэце, зьмяняючым істнуючыя кары за „пашыраньне фальшывых вестак" і за „зьнявагу ў друку", ці аб прэсавых праступленьнях ды карах.

Пасьля спробы з першым дэкрэтам, які быў спатканы навет у сучаснай Польшчы з такім абурэньнем усей прэсай, за выключэньнем аднаго толькі слаўнага віленскага „Слова",—урад новы свой праект „аброці на прэсу" аддаў сьпярша быццам на суд ды папраўкі саюзу польскіх журналістаў. Але, як сцьвярджае ўся польская прэса, урад ня толькі прыняў вельмі мала з папраўак, зробленых прадстаўнікамі польскай прэсы, але навет рад тых зьменаў, на якія згадзіліся прадстаўнікі ўраду ў супольнай камісіі, былі пасьля адкінуты Радай Міністраў. Апрача толькі таго, што прысуды ў справе „праступленьняў" прэсы мае выключна выдаваць судовая ўлада, увесь „дух" новага дэкрэту астаецца той жа самы, як і першага.

„Надзвычайная Сьледчая Камісія—для барацьбы з надужыцьцямі".

Рада Міністраў апрацавала праект дэкрэту ў справе стварэньня „Надзвычайнай Камісіі для барацьбы з надужыцьцямі, нарушаючымі інтарэсы дзяржавы". Камісія мае складацца з вышэйшых прадстаўнікоў суда і пракуратуры. Асабовы склад Камісіі мае назначыць Рада Міністраў, а зацьвердзіць п. Прэзыдэнт.

Камісія будзе мець правы папярэдняга сьледзтва (як сьледчыя судовыя ўлады), і дзеяльнасьць яе будзе пашырана на ўсю тэрыторыю Рэспублікі. Старшынёй Камісіі мае быць адзін з вышэйшых прадстаўнікоў Дзяржаўнага Кантролю.

Пагроза забастоўкі паштавікоў.

„Роботнік" друкуе гэткую заяву Сэкрэтарыяту Блёку Камунікацыйных Саюзаў (чыгуншчыкаў, паштавікоў і інш.):

„Блёк Камунік. Саюзаў на паседжаньні 14 крас., разглядзеўшы палажэньне, створанае ўрадам для працаўнікоў поштаў, тэлеграфу і тэлеф., прыняў аднагалосна гэткую пастанову:

Блёк прымае да ведама заявы прадстаўнікоў Саюзу Працаўн. Пошты, Тэлегр. і Тэлеф., што ў выніку рашучай адмовы з боку ўраду споўніць навет мінімальныя (найменшыя) дамаганьні працаўнікоў, ня гледзячы на тое, што з боку ўраду шмат разоў даваліся абяцанкі споўніць гэтыя дамаганьні, — ды прымаючы пад увагу, што паштовыя і іншыя прадпрыемствы даюць вельмі добры даход Скарбу, дазваляючы цалкам споўніць слушныя дамаганьні працаўнікоў,—настроі сярод масаў працаўнікоў у-ва ўсім краі завагніліся да таго, што ў кожную хвіліну можа выбухнуць дэманстрацыйная забастоўка.

Блёк сцьвярджае—што віна за магчымы выбух забастоўкі пратэсту, а таксама за ўсе далейшыя яе скуткі цалком спадае на ўрад, які, ня гледзячы на неаднакратна паказаныя яму рэальныя магчымасьці, ня хоча спаўняць абяцаньняў міністраў і дамаганьняў працаўнікоў пошты.

Блёк выражае сваю салідарнасьць з акцыяй паштавікоў, запэўняючы іх, што — на выпадак, калі б урад, у зьвязку з забастовачнай акцыяй паштавікоў, распачаў-бы проці борючыхся за паправу свайго быту якія-небудзь рэпрэсіі, — Блёк выступіць у рашучай форме — на абарону працаўнікоў пошты ў іх слушных дамаганьнях".

Характэрны працэс.

Як падае „Кур. Віл.", колькі даён назад у Роўным акружны суд разглядаў цэлы рад спраў рэдактара тыднёвіка „Всхуд". Сярод гэных спраў найцікавейшая была апошняя.

У стацьці „Ваявода Домбскі яшчэ ўрадуе" рэд. Махніцкі закідаў б. начальніку аддзелу бясьпечнасьці ў Валынскім ваяводзтве, Руткоўскаму, шовінізм і дзяленьне грамадзян на першую і другую катэгорыю. Руткоўскі выражаўся: „украінец-бальшавік, жыд-камуніст, люд вывротовец"... За ўрадаваньня Руткоўскага былі заарыштаваны тысячы ні ў чым не вінаватых украінцаў, пры чым неаднакроць была ўжывана сыстэма правакацый. На судовым працэсе гэтыя закіды былі пацьверджаны, і на гэтай падставе Махніцкага суд апраўдаў.

Усё гэта нам так добра знаёма...

Сьледзтва ў справе кражы паўтара мільёна злотых.

Польская паліцыя дагэтуль дарэмна шукае нейкага Кесьлера, які, украўшы паўтара мільёна казённых грошаў на пошце ў Крулеўскай Гуце (у Польскай Сілезіі), зьнік у няведамым напрамку. Цяпер быццам выкрыўся сьлед, які вядзе ў Данцыг, але шуканьні і там не далі вынікаў.

Зьезд ваяводзкіх камэндантаў паліцыі.

22 — 23 у Варшаве адбыўся зьезд ваяводзкіх камэндантаў дзяржаўнай паліцыі.

Зьезды польскіх „людовых" партыяў.

У чэрвені маюць адбыцца зьезды Вызваленьня і Польскага Сялянскага Саюзу (брыляўцаў). Газэты пішуць, быццам гэта—у зьвязку з набліжаючыміся выбарамі, якія — няведама яшчэ, ці адбудуцца, прынамся ў належны па закону час.

Заграніцай.

Ігра ў „перагаворы"...

Нямецкая прэса — на падставе інфармацыяў з Масквы ды з Варшавы — сцьвярджае, што ані Масква ані Варшава не разглядаюць паважна быццам распачатых перагавораў у справе заключэньня палітычнага ды гаспадарчага трактатаў. Польшча спрытна выкарыстоўвае гэтыя „перагаворы", каб націснуць на Амэрыку і Англію — у справе прысьпяшэньня пазыкі... Ведама-ж, для Амэрыкі добра распачатыя перагаворы даюць пэўныя гарантыі міру на „ўсходзе Эўропы" дый забясьпечаньня ўложаных у Польшчу капіталаў; на Англію гэтыя „перагаворы" дзеюць таксама „заахвочываюча да развязаньня кашаля", але — зразумела ж — дзеля зусім іншых прычынаў: Англія гатова даць Польшчы пазыку, — каб толькі Польшча сарвала гэтыя перагаворы... Нямецкая прэса сцьвярджае, што радавы ўрад ўсё гэта добра разумее ды зусім ня верыць ў шчырую волю польскага ўраду... Дый мы чулі ўжо аб гэтым зусім выразныя заявы адказных кіраўнікоў палітыкі СССР...

Пратэст Радавае Украіны.

„Тасс" паведамляе, што галава ўкраінскай рады народных камісараў, Чубар, выступіў з рашучым пратэстам проці плянаў некаторых буржуазных дзяржаў — адарваць радавую Украіну ад Саюзу СССР. Гэтыя дзяржавы вядуць нейкія перагаворы з самазванным „украінскім урадам" у Парыжу.

Пасьля радава-швайцарск. паразуменьня.

Уся эўрапэйская прэса займаецца справай паразуменьня Радаў з Швайцарыяй, якое раскрывае новыя магчымасьці прадстаўнікам СССР прымаць учасьце ў розных міжнародавых канфэрэнцыях, якія зазвычай адбываюцца ў Жэнэве. Першым вынікам гэтага паразуменьня было, як пішуць газэты, назначэньне сталага „наглядчыка" — паўнамоцніка Радаў у Лізе, які будзе прымаць бліжэйшае ўчасьце ўва ўсіх пачынаньнях і працах Лігі Народаў. Спадзяюцца, далей, учасьця — ужо на роўных правох з іншымі дзяржавамі — паўнамоцных дэлегатаў СССР у маёвай міжнародавай гаспадарчай канфэрэнцыі, якая будзе разглядаць найважнейшыя пытаньні нашага часу—аб сусьветнай эканамічнай палітыцы ды міжнародавай арганізацыі прадукцыі. Спадзяюцца, што ўчасьце прадстаўнікоў вялікага Сацыялістычнага Саюзу, які займае шостую часьць паверхні зямлі ды стварыў у сябе гаспадарчую сыстэму зусім іншую, чым у рэшце сьвету, — прыдасьць гэтай канфэрэнцыі асабліва цікаўны і важны характар. Ці дойдзе на канфэрэнцыі да нябывалага яшчэ ў гісторыі супрацоўніцтва сацыялістычнага гаспадарчага ладу з ладам капіталістычным,—пабачым.

Брыян мае цягнуць СССР у Лігу Народаў?

У Жэнэве гутараць аб тым, быццам Брыян рашуча маніцца ўцягнуць СССР у

Лігу Народаў. Дзеля гэтага, паміж іншым, ён моцна стаіць на тым, каб заключыць з радавым урадам новы трактат прыязьні і гаспадарчы. Гэтым усім Брыян маніцца адцягнуць ССРР ад выключных уплываў з боку Нямеччыны.

У справе ўрэгуляваньня дыпляматычных адносінаў між Югаславіяй і ССРР.

Папярэднія перагаворы, якія вядзе ад даўжэйшага часу Радавы пасол у Бэрліне Крэстинскій з тамтэйшым югаслаўскім пасломм, настолькі, як пішуць, пасунуліся наперад, што можна спадзявацца хуткага распачацьця афіцыяльных перагавораў між абудвума ўрадамі—у справе ўрэгуляваньня нармальных зносінаў між Югаславіяй і ССРР. Як ведама, Югаславія—адна з нямногіх дзяржаваў, якія яшчэ ня прызналі афіцыяльна ССРР.

Цікаўкая дыскусія ў ангійскім парляманьце.

У ангійскім Сойме лідэр лібэральнай апазыцыі Лёйд-Джордж выступіў з рэзкай крытыкай бюджэту мін. Чэрчыля. Асабліва востра выказаўся ён проці усё ўзрастаючых збраеньняў і выдаткаў на армію і флёт. Ангійскі флёт, казаў ён, і без таго сільнейшы, чым усе эўрапэйскія флёты, узятыя разам, а ўрад усё будуе новыя караблі, ламаючы міжнародавыя трактаты.

Чэрчыль, адказваючы Джорджу, прызнаў, што кітайская авантура мае каштаваць больш за 100 мільёнаў даляраў. Военныя выдаткі, казаў ён, — няшчасьце, але і канешнасьць для Англіі. Асаблівая небясьпека расьце для Англіі ў Азіі — з боку ССРР, з якім ніяк нельга дайсьці да паразуменьня.. Дык вось і прыходзіцца павялічываць збраеньні...

Італьянска-вэнгерскае паразуменьне.

Вэнгерская апазыцыя заяўляе, быццам Мусоліні ў часе размоваў з вэнгерскім прэм'ерам у Рыме — абяцаў памагчы вэнгерскім манархістам адбудаваць у Вэнгрыі манархію Габсбургаў. За гэта (?) прэм'ер Бэтлен абяцаў, што Вэнгрыя не заключыць ні з кім, апрача Італіі, ніякага саюзу.

Суровы прысуд у справе замаху на жыцьцё Мусоліні.

Толькі-што ў Рыме скончыўся працэс Занібоні, які — быццам у паразуменьні з ведамым генаралам Капэльля ды іншымі — зрабіў аружны замах на Мусоліні. Сам Занібоні і ген. Капэльля засуджаны на 30 гадоў турмы. Іншыя замахоўцы, якіх учасьце быццам сцьверджана судом, — на час значна меншы—ад 4 месяцаў да 12 гадоў. Адзін з галоўных замахоўцаў, засуджаны таксама на 30 гадоў, на шчасьце, знаходзіцца заграніцай.

Выраджэньне францускага сацыялізму.

Толькі-што закончаны кангрэс францускіх сацыялістаў выяўляе поўнае выраджэньне францускага сацыялізму. Перадусім кангрэс сцьвярдзіў вялізарныя розьніцы ў паглядах паасобных групаў ды фракцыяў нібы то адзінае сацыялістычнае партыі: адны стаяць за супольны фронт з камуністамі, другія—за паразуменьне з буржуазіяй, пачынаючы ад радыкалаў. Але—ані былое ідэі, ані веры ў сацыялістычны ідэал, ані былых вялікіх павадыроў францускі сацыялізм ужо ня мае. Кангрэс цікавіўся ды займаўся рознымі справамі, зьвязанымі з набліжэньнем выбараў. Дзеля таго ўсе рэзалюцыі кангрэсу былі вельмі кампрамісная характару.

Цікаўнай азнакай, вельмі абураючай польскую прэсу, былі гарачыя прывітаньні на кангрэсе—у чэсьць нямецкіх сацыялістаў. Рад аратараў запэўніў апошніх, што ў сэрцах французаў не асталося ўжо ніякіх агідных успамінаў вайны, ды што францускія сацыялісты гатовы падняць рашучую акцыю ў мэтах чым хутчэйшага ачышчэньня нямецкай зямлі ад чужаземнай акупацыі.

Арышт шпіёнскай арганізацыі ў Парыжу.

У Парыжу выкрыта грандыёзная міжнародавая шпіёнская арганізацыя, якая быццам працавала перадусім у Францыі — за бальшавіцкія грошы. Арыштаваны нейкі Колер, які стаяў на чале арганізацыі, літвін Гродніцкі (нейк—ня літоўскае прозьвішча?!), які шпіёніў у галіне паветранага флёту, і інш. — усяго 10 асоб.

Чаму зьмяніўся ўрад у Японіі?

Апошняй прычынай зьмены ўраду ў Японіі была нячуваная яшчэ дагэтуль у Японіі вялізарная катастрофа цэлага раду яе банкаў. Справа пачалася з банкруцтва найбагацейшай мільянэркі Японіі — нейкай Сазукі, якая пасьля вайны захапіла ў свае рукі ўвесь гандаль гарбаты ў Японіі. Апошнія трасэньні зямлі значна папсавалі яе плянтацыі гарбаты, і ад гэтага ўдару яе прадпрыемства ня здолела ачуняць. Банкруцтва гэтай фірмы пацягнула за сабой крах цэлага раду найвялікшых банкаў, зьвязаных з ей. І вось, урад пастанавіў прыйсьці з дапамогай гэтым збанкрутаваўшым банкам. Пастанавіў асыгнаваць вялізарныя сумы — штосьці да 800 мільёнаў ен (японская ена амаль ня роўная даляру). Але парлямант рашуча адкінуў гэтую пастанову ўраду. Тады ўрад выйшаў у адстаўку.

Але трэба думаць, што гэта прычына—толькі прычэпка да ўраду, каб скінуць яго, стварыўшы на яго мейсца ўрад больш ваяўнічы, які б мог лягчэй супрацоўнічаць з Англіяй і Амэрыкай у рашучым умяшацельстве ў кітайскія справы. Дык на чале ўраду ду стануў барон Танака, ведамы, як прыхільнік рашучай акцыіі Японіі ў Кітаі.

Трэба думаць, што Кітаю прыдзецца дорага заплаціць за тое разьбіцьце сілаў, якога даканаў толькі-што Чанг-Кай Шэк.

Гоняць ксяндзоў з Мэксыкі.

Прэзыдэнт Мэксыкі Калёс выдаў загад аб высяленьні з краю аднаго біскупа і раду ксяндзоў, асабліва актыўна бароўшыхся проці ўраду.

Палажэньне ў Літве.

Навет хрысьціянская дэмакратыя—у апазізыі.

Літоўская хрысьціян. дэмакратыя маніцца адклікаць сваіх прадстаўнікоў з ураду ды перайсьці - побач з людоўцамі і сацыялдэмакратам—да апазіцыі. Гэта ж—пасьля таго, як урад з прэзыдэнтам на чале адкрыта заявіў, што сам пражане усялякіх „парлямантарыяў" і створыць—дыктатуру.

Вялікодная перадышка—ад ваеннага палажэньня.

Ваенны стан у Літве, які трывае ад сьнежнёвага перавароту, быў неяк злагоджаны 16 га красавіка. Думалі, што назаўсёды. Але 20-га красавіка ваеннае палажэньне ізноў вернена—ува ўсей суровасьці.

Урадавы крызіс.

Спадзяваны ўрадавы крызіс пачаўся. На паседжаньні Рады Міністраў 22 красавіка 2 міністры падаліся ў адстаўку, а 2 другія заявілі аб аканчальнай пастанове выйсьці з складу ўраду. Як можна было прадбачыць, прэм. Вальдэмарас не зьлякаўся гэтых заяваў; наадварот, ён маніцца абаперціся толькі на адных крайніх нацыяналістах фашыстах, за ўсялякую цану захоўваючы сабе падтрымнньне арміі. На Сойм — па добраму ды агульнаму цяпер звычаю—плюе!

Фашызацыя Югаславіі.

Фашызацыя Эўропы, распачатая Мусоліні, ідзе ўсьцяж далей, захопліваючы ўсё новыя дзяржавы—пры магутным падтрыманьні рэакцыйнага ангійскага ўраду. Апошні ўрадавы крызіс у Югаславіі, выкліканы правакацыйнай палітыкай Італіі на Балканах, скончыўся ўтварэньнем новага ўраду, які мае ўсе азнакі фашызму.

Павадыр незалежнай дэмакратычнай апазіцыі Прыбічэвіч слушна заявіў журналістам, што адбыўся ў сутнасьці „замаскаваны зэмах стану", ці—дзяржаўны пераварот. Запраўды ж—урад створаны без паразуменьня з парлямантам, які ня толькі быў адсунуты ад гэтага акту, але распушчаны на неабмяжаваны час, бо 1 жніўня, калі ён мае сабрацца нанова, спадзяюцца дэкрэту караля аб роспуску гэтага парлямэнту зусім і вызначэньня новых выбараў.

Урад створаны выключна з адных сэрбаў: ніводнага харвата, ні славенца ў ім няма. Дый то, як бачым, з сэрбскіх партыяў у склад ураду ўвайшлі толькі „вялікасэрбскія" радыкалы-нацыяналісты і зродныя ім правыя „дэмакраты", пры тым гэтыя апошнія навет прадстаўлены вельмі слаба. Найхарактэрней, што ўрад створаны цішком—у адну раніцу—без паразуменьня з соймавымі клюбамі, але пры беспасярэднім учасьці самога караля... Галава габінэту Вукічэвіч, як і яго міністар замежных справ Марынковіч, — выдатныя сэрбскія імпэрыялісты, якія, побач з унутрана палітычным лёзунгам: „Югаславія для сэрбаў", выстаўляюць для вонкавай палітыкі Югаславіі кліч: „Балканы для балканскіх народаў".

Ясна, што новы югаслаўскі габінэт мае выразна рэакцыйны і ваенны, баявы характар, скіраваны проці Італіі. Прэса падчыркнула навет тое, што міністрам камунікацыі назначаны ваенны генарал. Югаслаўская прэса—пасьля апошняга кроку Мусоліні, які сарваў распачатыя ўжо беспасярэднія перагаворы з Югаславіяй у справе канфлікту аб Альбанію, — піша: „Злая воля Мусоліні, які перастаў слухаць навет перасьцерагаючых радаў Лёндану,—зусім ясная. Але датаго ж наша добрая воля ў справе паразуменьня была прынята ў Італіі, як знак слабасьці"...

Гэткім чынам сцьвярджаем яшчэ раз на новым прыкладзе Югаславіі **катастрафічны ўзрост злой волі ў Эўропе** пад яўным уплывам фашыстаўскіх урадаў Італіі і Англіі. А да чаго імкнецца ды пхае іншых гэтая злая воля, ведама ж кожнаму...

Найцікаўней для стану бяссільнай проці панаваньня гэтай злой волі Эўропы—тое, што ня толькі Англія, але навет і Францыя, ня кажучы ўжо аб Італіі, ня хочуць перадаваць справу італьянска-югаслаўскага канфлікту ў Лігу Народаў. Чаму? — Таму, што баяцца за „аўтарытэт гэтай высокай установы". Бо што ж будзе, калі Мусоліні — ня толькі адмовіцца падчыніцца пастанове Лігі, але—у разе перадачы ей справы, папросту выступіць разам з „сваей Італіяй" з Лігі?.. Добры „аўтарытэт", які трэба ахоўваць гэткім спосабам...

ХРОНІКА.

АД РЭДАКЦЫІ. **Дзеля таго, што працаўнікі Рэдакцыі, Адміністрацыі і Друкарні, па вызнаньню праваслаўныя, сьвяткавалі Вялікдзень па стараму стылю, — мы і ў гэтым тыдні маем магчымасьць выпусьціць газэту толькі адзін раз замест двух, аб чым і папераджаем нашых падпішчыкаў.**

Звычайны агульны гадавы сход Віленскага Беларускага Каапэратыўнага Банку. Управа Бел. Коопэр. Банку ў Вільні гэтым паведамляе, што, згодна пастановы Наглядной Рады і Управы Банку ад 30 сакавіка г. г. і на аснаваньні § 34 Статуту, адбудзецца **звычайны агульны гадавы Сход сяброў Банку 29 красавіка 1927 г.** у 4 гадзіны папаўдні, у памяшчэньні Банку (Вільня, Віленская 8).

Парадак дня:

1) Адчытсньне пратаколу папярэдняга Агульнага Сходу;
2) Агульная справаздача Банку за 1926 г.;
3) Фінансавая справаздача (балянс) Банку за 1926 г.;
4) Справаздача Наглядной Рады;
5) Бюджэт расходаў на 1927 г.;
6) Справа зьмены §§ 9 і 14 Статуту Б. К. Банку;
7) Стварэньне рэзэрвнага капіталу;
8) Давыбары членаў Наглядной Рады.

Управа.

Выбары ў мястовыя самаўрады на Палесьсі. Міністар унутран. спраў упаважніў палескага ваяводу назначыць у м. м. Лунінцы і Кобрыне — выбарных камісараў. Дзень выбараў мае назначыць ваявода. Выбары маюць адбыцца паводле закону ці дэкрэту б. Камісара Усх. Зямель Асмалоўскага.

Умова парабкоў з абшарнікамі ў Пружаншчыне. У „Monitorze Polskim" з 23 красавіка зьмешчана ўмова між парабкамі і абшарнікамі аб варунках работы і аплаце працы ў дварох на працяг 1927—28 службовага году ў Пружанскім павеце.

Да сьвяткаваньня 1-га мая. У сувязі з падгатоўкай работніцкіх арганізацыяў да сьвяткаваньня 1-га мая, у горадзе разышліся чуткі, што эндэцка-фашыстаўскія баёўкі, па прыкладу мінулых гадоў, рыхтуюцца да бандыцкага нападу на мірныя маніфэстацыі работнікаў. Буржуазія, якой работнікі ніколі не перашкаджаюць у яе ўрачыстасьцях, ня можа сьцярпець, калі работнікі ладзяць свае ўрачыстасьці...

Узнаўленьне публічных лекцыяў. У гэту суботу, 30-га красавіка, пасьля сьвяточнага перарыву, узнаўляюцца папулярныя публічныя лекцыі ў памяшчэньні Цэнтральнага Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў Вільні (вул. сьв. Анны 2). Чытаць будзе д-р Ян Станкевіч на тэму: **„Расейцы і мы"**.

Пачатак лекцыі ў 7 гадз. увечары.

Правы мовы „меншасьцяў". Міністар асьветы выдаў 12-га красавіка цыркуляр, у якім гаворыцца аб ужываньні моваў нацыянальных меншасьцяў у школах і прытулках.

Цыркуляр прызнае, як агульнае правіла, што ў дзяржаўных школах і прытулках усе акты, пасьведчаньні і карэспандэнцыя мусяць быць пісаны у польскай мове. Таксама папольску адбываюцца ўсе гутаркі на паседжаньнях пэдагагічных радаў ды пішуцца ўсе надпісы ў сярэдзіне школьных памяшчэньняў і вонках.

З гэтага агульнага правіла вылучаюцца тыя дзяржаўныя школы ды прытулкі, у якіх мовай выкладовай зьяўляецца **няпольская** мова. У такіх школах і прытулках уводзяцца гэткія правілы адносна да мовы:

а) Надпісы і ўсялякага роду абвесткі ў сярэдзіне і вонках школьнага будынку пішуцца ў дзьвюх мовах, пры чым мова няпольская — направа або пад польскай.

б) Усе школьныя акты, а таксама ўрадавы падзел гадзін — пішуцца ў дзьвюх мовах.

в) На жаданьне бацькоў ці апякуноў дзяцей школьныя пасьведчаньні і паведамленьні будуць выдавацца на блянках, друкаваных у дзьвюх мовах і ў абедзьвюх гэтых мовах запаўняных. Аб гэтым сваім праве бацькі і праўныя апякуны дзяцей маюць быць асобна паведамлены.

г) На ўсялякія паданьні і пісьмы ў мове недзяржаўнай кіраўніцтва такіх школаў адказвае ў мове паданьня (пісьма).

д) На паседжаньнях пэдагагічных радаў і розных школьных канфэрэнцыях можна прамаўляць у выкладовай мове данае школы, і ў гэтай-жа мове пратакалуецца такая прамова.

У так-званых двуязычных (утраквістычных) школах маюць сілу ўсе гэтыя правілы, апрача пункту б).

У выпадках, прадбачаных у пунктах в) і г), для школаў з няпольскай выкладовай мовай дапускаецца ўжываньне пячатак у дзьвюх мовах.

Для прыватных школаў не стаўляецца ніякіх перашкодаў у карыстаньні мовай, у якой адбываецца навучаньне. Аднак, калі-б школам гэткім было дадзена права публічнасьці (правы дзяржаўных школаў), дык усялякія пасьведчаньні яны мусяць тады выдаваць і ў дзяржаўнай мове—побач з тэкстам у мове навучаньня.

Усё гэта дужа пекна. На жаль толькі, нам, беларусам, мала прыдзецца карыстацца новым цыркулярам: адзіная на ўсю Польшчу белуская ўрадавая сямёхгодка ў Горадні ліквідуецца (усе вучыцялі з канцом сёлетняга школьнага году звольнены з займаных пасад!), руйнуюцца беларускія гімназіі ў Вільні і Радашкавічах (найлепшыя з усіх!), а „ўтраквістычных" (двуязычных) школ мы маем адно толькі 17 на ўвесь віленскі школьны вокруг...

ВЯСНА.

Ізноў вясна—вадзіца льлецца,
Шчабечуць птушкі, лес сьмяецца;
Сьмяецца ціхім ясным сьмехам:
Канец зіме—яе пацехам;
Канец бядзе, —
Вясна ідзе!
Вясна з красой бяроз сукрыстых,
З пуком вяночкаў тых квяцістых...
Прышла прыгожая багіня,
Што ў душу кожнаму вакіне
Прамень сьвятла, —
Вясна прыйшла!
Цябе я ждаў,—о ты, сьвятое
Дзіця, бязьвінна маладое!
Што ты нясеш з сваім прыходам?
Ці раз мінаў так год за годам,
У душы-ж маей
Што раз цямней...
Нічога мне ня трэ—нічога!
Адно каб шчасьця сьвет людзкога
Прыйшоў з табой, вясна, да нас!
Вясна, вясна, хоць гэты раз
Пацеш мяне:
Хай крыж міне...
Цяжкі наш крыж, цяжкі праз меру,
Хоць ты, вясна, сьвятую веру
У той лепшы час ў душы маей
Узмацуй надзеяй, ды мацней
Закуй—скрапі...
Душа, цярпі!
Вясна прыйшла. Скрозь шум вясьняны,
У зялёнай вопратцы паляны
Цьвітуць, прыгожа так цьвітуць;
Вада шуміць, бары гудуць:
Наўкола цуд —
На сэрцы смут.

Міхась Васілёк.

Песьня жаўранка.

У лазурнай, сьветлай вышы
Песьня звонкая чуваць;
Сіню даль яна калыша,
Будзіць поле, сенажаць....
Тае песьня маладая
Між прастору і палёў;
Краска кожная ўбірае
Сокі гукаў і таноў.
Васілёчак галавою
Ледзь прыметна шле прывет
І усьмешкай залатою
Ціха дорыць польны сьвет.
Сэрца б'ецца, аджывае
Пасьля зімніх халадоў, —
Тае песьня маладая
Між прастору і палёў...

Вільня, 1926 г. **Хв. Ільяшэвіч.**

Беларуская мова ў Праваслаўнай Сэмінарыі ў Вільні. Міністэрства Вераў і Асьветы прыслала Прав. Дух. Сэм. ў Вільні расклад лекцыяў к налецьцю (1927/28 школьн. году). Паводле гэтага раскладу беларуская мова будзе выкладацца 16 гадзінаў (ад 2—9 клясаў улучна па 2 гадзіне).

У 1923 г. беларуская мова мела 18 гадз., летась 17 гадз., сёлета чамусьці так сталася, што асталося ў ей усяго 8 гадз. і на лета будзе 16 гадз.

Гэткую долю перажывае беларуская мова ў школе, дзе гатуюцца пастыры для беларускага народу і дзе яна павінна была б быць мовай выкладовай.

З навуковае нівы. Беларускае Навуковае Т-ва ў Вільні атрымала гэтымі днямі пачку навуковых выданьняў у беларускай мове ад Інстытуту Беларускае Культуры ў Менску. Іменна:

1) Праца Навуковага Т-ва па вывучэньню Беларусі пры Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Сельскае Гаспадаркі ў Горках. Том І. Зьмяшчае 16 навуковых досьледаў з галіны глебазнаўства, краёвае расьліннасьці, жывёлаводзтва, лесаводзтва і іншых галін сельскае гаспадаркі Беларусі. Сустракаем імёны прафэсароў Салаўёва, М. Бурштэйна, Зіхман-Кедрава, Ключарова, Мельніка, Перахода, Кораткаэа, Люнгерсгаўзэна і інш. У кніжцы каля 200 стр. і шмат рысункаў і плянаў.

2) Працы Першага Усебеларускага Краязнаўчага Зьезду 7—11 лютага 1926 году. У зьезьдзе прымалі ўчасьце 146 дэлегатаў з усіх акругаў Радавае Беларусі.

3) Матар'ялы да геалягічнага і глебазнаўчага вывучэньня Беларусі. Працы Першае Усебеларускае Глебазнаўчае Канфэрэнцыі 16—17 красавіка 1924 г. пад рэдакцыяй **А. Смоліча** зьмяшчае вельмі цікаўныя даклады, прачытаныя ўчасьнікамі зьезду.

4) Працы Зьезду Дасьледчыкаў Беларускае Археалёгіі і Археаграфіі 17—18 студзеня 1926 г. Апрача пратаколу і рэзалюцыяў зьезду, зьмешчаны даклады: Праф. М. Даўнар Запольскага: Старыя беларускія архівы за межамі БСРР; Зьмітра Даўгялы: Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі; М. Мялешкі: Архіўная справа ў БСРР да сучаснага мамэнту; А. Ясенева: Навуковае значэньне Віцебскага Акруговага Аддзелу Цэнтральнага Архіву БСРР; В. Дмітрыева: Смаленскія архіўныя фонды.

5) Зборнік Асоцыяцыі Навуковае Арганізацыі Працы за 1925—1926 акадэмічны год.

6) Беларуская Навуковая Тэрміналёгія. Выпуск VII. Музычныя тэрміны.

7) Беларуская Навуковая Тэрміналёгія. Выпуск VIII. Слоўнік лясных тэрмінаў.

8) Анатамічныя тэрміны. Выпуск.

9) Праф. Фядзюшын. Кароткая інструкцыя да зьбіраньня і аховы зоолёгічных калекцый.

10) К. Кіпрыянец. Грамадзкія севазвароты ў вёсцы і пераход да іх.

11) Два сшыткі часопісі „Наш Край".

Рад друкаў Жыдоўскага Аддзелу Інбелкульту у жыдоўскай мове.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

Рэзалюцыя

Агульнага сходу сяброў Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Хвайнянах, Скідэльскай воласьці Горадзенскага павету.

„Дзела таго, што мы, беларусы, з-прадаўна засяляем наш Родны Край Беларусь— мы, сучаснае пакаленьне, дасталі ад дзядоў і прадзедаў сваіх, як спадчыну, цэлы акіян гора і мук, якія яны пераносілі ад веку. Але галоўнай прычынай мук гэтых была цемра, што акружала іх з усіх бакоў. І мы, як дзеці іх, унасьледавалі ад іх гэту цемру а разам з ёй і ўсе няшчасьці, што сягоньня вісяць над намі. Мы пэўны ў тым, што няшчасьці гэтыя будуць вісець над намі да таго часу, пакуль будзе жыць між намі цемра—няпісьменнасьць. Дзеля гэтага мы дамагаемся сваей роднай беларускай школы, у якой бы мы вучыліся на сваей— беларускай мове. Мы пераканаңы ў тым, што толькі з адчыненьнем сваіх школаў мы зможам паставіць свэю культуру на роўні з культурамі іншых, свабодных народаў, сягоньня атерадзіўшых нас у гэтым сэньсе. Дамагаемся таксама ўрадовых вучыцельскіх беларускіх курсаў, якія-б маглі даць кадр добра выкваліфікаваных вучыцялёў для беларускіх школ, каторых мы дамагаемся. Дамагаемся таксама ўрадовых беларускіх сярэдніх школ і жадаем, каб тыя сярэднія школы, якія сягоньня істнуюць, як прыватныя, былі зроблены ўрадовымі, бяз зьмены іх нацыянальнага беларускага характару. Мы просім прылучыцца да гэтага клічу, да гэтае рэзалюцыі ўсіх сяброў Т-ва Беларускае Школы і наагул усе беларускае грамадзянства, бо ведаем, што ўсе яны адчуваюць на сабе ярмо цемры.

Грамадзяне! Цяпер мы яшчэ ў цемры, але пачыходзім ужо да запраўднае, простае, чыстае дарогі. Нашы твары асьвяціла ўжо пуцяводная зорка навука, да якой мы і павінны цяпер імкнуцца. Хай зорка гэта асьвеціць нам наш цярністы шлях, хай ускалыхне, узварушыць увесь Беларускі Народ, каб давясьці яго да прастору зьяючага сьвятлом—Навукі! У ёй мы знайдзем і сваё шчасьце і сваю долю. Дык дамагайцеся ўсе і падтрымайце нашы дамаганьні.

Грамадзкая ахвярнасьць на культурную справу.

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Хвайнянах, Скідэльскае воласьці, Горадзенскага павету, шчыра дзякуе грамадзянам вёскі Лаўні, якія адгукнуліся на заклік Хвайнянскага Гуртка і склалі ахвяры грашыма на карысьць бібліятэкі-чытальні Т-ва ў вёсцы Хвайнянах:

Юрку Манкевічу за 1 зл., Рыгору Манкевічу за 1 зл., М. Жуку за 20 гр., П. Пенкаўскаму за 50 гр., М. Завіленчыку за 1 зл., Д. Рэкецю за 1 зл., П. Ваўцкевічу за 50 гр., П. Байду за 50 гр., А. Манкевічу за 50 гр., К. Казлу за 50 гр., К. Саўцы за 20 гр., П. Жуку за 50 гр., Антону Жуку за 50 гр., Ст. Саўцы за 50 гр., Г. Жуку за 50 гр., Казеку за 50 гр., Н. Мышчыку за 50 гр., Данілу Іваноўскаму за 1 зл. 50 гр., В. Клацку за 1 зл., А. Цэрэтку за 50 гр., Р. Жуку за 20 гр., Я. Самойле за 25 гр. і Касмоўскаму за 10 гр.

Хвайнянскі Гурток Т-ва Беларускае Школы шчыра дзякуе таксама і грамадзянам вёскі Хвайняны, якія на адчыненьне бібліатэкі-чытальні ў в. Хвайнянах злажылі 14 зл. і на пашырэньне яе злажылі другі раз 13 зл. 55 гр.

Чэсьць Вам, дарагія грамадзяне, за Вашы грашавыя ахвяры, якія пойдуць на вялікую справу — на адбудову культуры Беларускага Народу.

Хвайнянскі Гурток Т-ва Бел. Школы.
Управа Гуртка.

„Labor omnia vincit improbus".

(Баранавіцкі павет).

Есьць ведама, трудна што-колечы зрабіць, калі няма зашто рук зацяць, аднак і тут трэба брацца да працы. Хай кожваму паслужыць нормай разумны сказ Віргілія, „Упартая праца ўсё пераконывае". Да гэтага ня трэба факту, бо сьведчаць доказы сучаснага жыцьця на кожным кроку.

Вазьму, напрыклад, адну добра вядомую мне вёску Хлюпічы, якая хварэла з даўніх часаў на культурную непрадукцыйнасьць, а пасьля вайны яна зусім апала, а гэта пацягнула сялян у няволю і пажаваньне цемры. Сталі адзін на аднаго даносіць розныя кляўзы сваім-жа ворагам, а тым адно гэтага і трэба — цягаюць па пастарунках. Але вось у в. Хлюпічах, як грыбок у туманную раніцу, зьявіўся Гурток Т-ва Бел. Школы, які ад першага дня пачаў барацьбу з цемрай, прапануючы ўсім сялянам пакінуць брудаснае жыцьцё.

Такім чынам, з жменькаю сяброў, за кароткі час гэны Гурток адчыніў Народны Дом і бібл.-чыт. За двух тыднёвы час паставілі пяць спэктакляў — грошы пайшлі на прылады Нар. Дому і кніжкі. Арганізавалі хор, драматычную сэкцыю, зрабілі паходную сцэну і цяпер працуюць на гмінным абшары. Калі гралі „Выбары Старшыні" ў Хлюпіч — у той мамэнт прыехаў Войт, Камандант паліцыі і прадстаўнік Старасства, то пыталі, каторыя тут прыехаўшыя з Вільні. А калі запяяў хор, дык успомненая, таксваная інтэлігенцыя, не далі канчыць, як пачалі сьціскаць руку сябру Тарасэвічу за ягоныя здольнасьці.

Як жа-ж прыемна прымаць падзякі пасьля ўсяго гэтага: і ці можа хто прадставіць, як лёгка выставіць на сцэну вясковую дзяўчыну і што яна пасьля можа чуць ад суседак. Аднак усё гэта змаглі і цяпер ніхто не сьмяецца, кожны стаў адчуваць і дзівіцца, што Беларусь можа мець шмат чаго харошага—сваіх пісьменнікаў і г. д. На Вялікдзень маняцца ставіць „Модны шляхцюк", „Пасланец", „Па рэвізыі", „Чорт і Баба" і „Паўлінку".

Пасьля ўсяго гэтага прыемна бачыць, якія таленты і здольнасьці зьявіліся ў тых „цёмных" людзей. Дык вось, што можа зрабіць напружаннае змаганьне, хай паслужыць яно ў прыклад другім вёскам. **Гучны.**

Як крэдытуюць сялян насеньнем.

(М. Ляхавічы, Баранавіцкага пав.)

Неяк у сакавіку месяцы солтыс нашае вёскі абвясьціў, што павятовы соймік пажычае на насеньне аўса або выдае грашыма тым сялянам, што ня маюць свайго насеўку, каб абсеяць сваю зямлю. Дзеля гэтага ён загадаў зрабіць сьпісак асоб ня маючых на сеўку і жадаючых атрымаць насеньную пажычку. Сяляне, ня маючыя насеўку былі вельмі здаволены гэтай весткай. Але, як аказалася, ня так гэта лёгка дастаць гэту пажычку. Хутка я даведаўся, што ў гміне пажычкі атрымаць ня можна, а што выдае іх банк. Гэта мяне расчаравала, бо ведаў я добра, як лёгка чагось дабіцца ў банку.

Скажу некалькі слоў аб паўстаньні і істнаваньні банкаў у м. Ляхавічах. Яшчэ ў 1921 годсе паўстаў у м. Ляхавічах ксяндзоўска-абшарніцкі банк пад назовам „Chrześcijański Bank Ludowy" без абмежанай адказнасьці, які з сялян, жадаючых атрымаць пазыку, браў сяброўскую складку і бязлітасна дзёр працэнты. Зразу браў па 8%, пасьля па 5% і ўрэшце па 3½% у месяц. Селянін, які ўзяў большую пажычку — да гэтага часу яе яшчэ ня выплаціў, добра калі хоць працэнты аплаціў. Нядаўна паўстаў новы банк, цяпер ужо кулацка-мяшчанскі. Ня ведаю добра, як ён завецца, але кажуць, што гэта якісь „Rolniczy Bank". Банк гэты абвесьціў двухпрацэнтавую пазыку, дык і першы банк змушаны быў зьніжыць працэнты да гэтае нормы.

Вось-жа я і пашоў у банк гэты, каб атрымаць пазыку насеўкам. Але бухгальтэр банку п. Клімок мне заявіў, што, каб атрымаць пазыку насеньнем, трэба стаць сябрам банку, а мне, як ня сябру, запрапанаваў ісьці ў новы банк. Што-ж, пайшоў я і ў новы банк. Але там яшчэ лепш, як аказалася. Каб атрымаць пазыку, трэба стацца сябрам банку, дзеля чаго трэба на першы пачатак унесьці 12 зл. сяброўскія складкі. Такім чынам, калі якісь селянін захоча атрымаць у пазыку насеньне напрыклад 6 пудоў — дык мусіць панясьці такія расходы: унясьці сяброўскую складку 12 зл. у банк; у канцы году заплаціць за авёс па 7 злотых 86 гр. за п. — за 6 п. 46 зл. 86 гр.; заплаціць працэнту 2 зл 34 гр. Такім чынам разам трэба было-бы ў восень заплаціць 49 зл. 20 гр. Калі да гэтага дадамо яшчэ пай у ліку 12 зл. — дык пажычаных 6 пудоў аўса будуць каштаваць 61 зл. 20 гр. А, маючы грошы, на рынку селянін можа купіць гэтых 6 пудоў аўса за 42 зл. Дык якая ж тут дапамога, пытаюся? Цікава, няўжо ж тыя, хто даюць гэту пазыку, не маглі аддаць яе сялянам беспасярэдня, або праз гміну? Няўжо ж, каб ня было банкаў у м. Ляхавічах, дык сяляне бы не атрымалі пазыкі на насеньне? **В. Я.**

З Радавае Беларусі.

Сьвяточны Сялянскі Унівэрсытэт.

У Радавай Беларусі ў Горы-Горках адчыняецца Сялянскі Унівэрсытэт, у каторым будуць заняткі ў нядзелі.

Чарнасоценскае ўзгадаваньне.

Значная лічба беларускіх студэнтаў у С. С. Р. Р., як і даўней, вучыцца ў Ленінградзкім унівэрсытэце. Ад якогась часу асеў таксама ў Ленінградзе, як праф. унівэрсытэту, ведамы філёлёг акадэмік, але й ведамы рэакцыянэр і русыфікатар праф. Карскі. Карскі ўсё жыцьцё стараўся русыфікаваць Беларусаў і асабліва наеўся на беларускі рух у вапошнім часе, будучы справядліва скрытыкаваны ў Менску, як аўтар апошняе кнігі „Бѣлорусы" (аб новай літаратуры беларускай). Вось-жа частка ленінградзкіх студэнтаў беларускіх у большасьці сыноў б. ураднікаў і паноў—падпала пад уплыў Карскага і пад. да яго русыфікатараў. Гэтыя студэнты, зарганізаваныя ў „Полоцкім землячестве", нядаўна выдалі адозву проці ўвядзеньня беларускае мовы ў школы й урады Радавай Беларусі.

Беларусы у Латвіі.

Зацьверджаньне статуту Таварыства Беларускага Тэатру.

25-га сакавіка, пастановай рэгістрацыйнага аддзелу Рыскага Акружнога суду, зацьверджаны статут Т-ва Беларускага Тэатру ў Латвіі.

Сябры—ініцыятары Т-ва сабраліся ў нядзелю 5-га сакавіка на першы арганізацыйны сход і выбралі першае часовае праўленьне Т-ва, якое ўжо прыступіла да працы.

Т-ва павінна запоўніць той прабел у беларускім нацыянальным жыцьці ў Латвіі, які так востра адчуваўся: даўно ўжо насьпела патрэба мець свой сталы беларускі тэатр у Рызе і ў Дзьвінску, а таксама і вандроўную трупу, якая магла-б аб'яжджаць беларускія вёскі ў Латвіі.

Беларусы у Амэрыцы.

Беларускі мітынг у Чыкаго.

У нядзелю 6 га сакавіка ў Сігавом доме адбыўся вялікі беларускі мітынг пратэсту супроць масавых арыштаў беларускіх дзеячоў у Заходняй Беларусі.

З прамовамі і дакладамі выступалі амэрыканскія беларускія дзеячы: У. М. Рамановіч, Язэп Варонка, Антон Змагар праф. М. М. Цімафееў, д-р Ян Слук, а таксама прадстаўнік латвійскіх беларусаў В. Траф'мовіч.

Мітынг ладзіўся Беларускім Нацыянальным Хаўрусам штату Іллінойс і выклікаў вялікую зацікаўленасьць беларускае калёніі ў Чыкаго.

Народу набралася шмат. Панаваў узрушаны настрой. Прамоўцаў горача і спачувана віталі. Асаблівае зварушаньне панавала на мітынгу, калі былі паказаны фатаграфіі пацярпеўшых беларускіх дэпутатаў, якіх многія з прысутных на мітынгу ведалі асабіста.

Мітынг аднагалосна прыняў рэзалюцыю пратэстаў супроць апошніх падзеяў у Заходняй Беларусі і ўхваліў зьвярнуцца да Амэрыканскага Народу з просьбай аб дапамозе.

Пастановы і рэзалюцыі мітынгу, як і агульнага сходу ў Гранд Рапідзе, накіраваны ў Амэрыканскі Кангрэс і Сэнат праз дэпутатаў штату Іллінойс.

Падобны ж мітынг крыху раней (20 га лютага) адбыўся і ў Гранд-Рапідасе, у штаце Мічыган.

Беларуская канфэрэнцыя.

У хуткім часе мае быць склікана Канфэрэнцыя беларусаў з штатаў Іллінойс, Мічыган, Індзіана і Віsконц, на якім будзе абгаворана палажэньне ў Заходняй Беларусі, а таксама справа шырэйшай дапамогі сваёй многапакутнай Бацькаўшчыне з боку амэрыканскіх беларусаў.

Усячына.

Грашавітыя павадыры францускіх „сацыялістаў".

Сярод павадыроў абуржуазіўшагася францускага „сацыялізму" ёсьць вельмі багатыя людзі, якія самі асабіста зьяўляюцца ўласьнікамі ня толькі вялізарных маёнткаў, дамоў, капіталаў, але і фабрыкаў, у якіх працуюць тысячы работнікаў. Але найбагацейшымі з гэтых „работніцкіх павадыроў" зьяўляецца Леон (Лявон) Блюм і Поль (Павал) Бонкур.

Першы з іх — мільянэр, мае вялізарныя фабрыкі, здаецца, шаўковых вырабаў; апрача таго, Блюм — адвакат, які выступае часта з боку багатых прамыслоўцаў і наагул — капіталістаў,—ведама-ж, за добрыя грошы.

Другі з іх — таксама адвакат, зарабляе толькі адвакатурай 2 мільёны ў год, ня лічучы таго, што мае з сваіх капіталаў — у розных прадпрыемствах,—пэўна-ж не „сацыялістычных", але—капіталістычных. Нядаўна гэты Бонкур выступіў на судзе ў працэсе нейкай нямецкай прынцэсы проці нямецкай дэмакратычнай рэспублікі, — ведама ж, ня з боку дэмакратыі, але — былой „каранаванай асобы".

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.